80 ГАДОЎ ВЫЗВАЛЕННЯ БЕЛАРУСІ

# Памяць у мастацкім слове

**Заключны этап рэспубліканскага конкурсу чытальнікаў адбыўся ў Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў 20 і 21 лістапада. Творчае спаборніцтва прымеркавалі да 80-годдзя вызвалення нашай краіны ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне.**

Заяўкі на ўдзел даслалі больш за 2000 ахвотных ва ўзросце ад 10 да 25 гадоў з розных рэгіёнаў. У фінальны тур трапілі 76 прэтэндэнтаў. На суд экспертаў яны вынеслі паэтычныя і празаічныя творы грамадзянскай і ваенна-патрыятычнай тэматыкі на абедзвюх дзяржаўных мовах. Такім чынам таленавітая моладзь засведчыла адданасць духоўным і гістарычным каштоўнасцям беларускага народа.

Найлепшых чытальнікаў у трох узроставых катэгорыях вызначыла прафесійнае журы. У яго складзе — прадстаўнікі Міністэрства культуры, БДУКМ, Белдзяржфілармоніі, Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы і Беларускага дзяржаўнага маладзёжнага тэатра. Эксперты зважалі на ўзровень выканальніцкага майстэрства, увасабленне мастацкіх вобразаў, тэхніку і культуру маўлення, цэласнасць, яркасць ды індывідуальнасць выступленняў.

Мяркуецца, што пераможцаў конкурсу запросяць да ўдзелу ў рэспубліканскіх і рэгіянальных культурных мерапрыемствах.